Юрась Пацюпа



...няма паміж імі ні сваркі,
ні зайздрасьці...

# Рассыпаныя каштаны

*Абразкі*

## *КАШТАНЫ*

Павеяў вецер – і з вялікага дрэва пасыпаліся каштаны. Густа-густа, усё роўна, як з кошыка. І хоць боязна, але захацелася стаць пад гэты багаты, гойны дождж, адчуць яго ёмкія ўдары і напоўніцца восеннаю шчадрынёю. Стала шкада, што гэтакі дар, нікім не заўважаны, разьляціцца, рассыплецца па асфальце і, урэшце, будзе растаптаны цяжкімі падэшвамі, вострымі абцасікамі.

*28.09.99 г.*

## *СВОЙСКІ ЧМЕЛЬ*

Дружна спраўлялі сваё млечнае сьвята кусты і дрэвы. З драўляных нораў павысоўваліся пакаме-

чаныя матылі, заспаныя пчолы, зьнясіленыя чмялі. А адзін чмелік так за зіму аслаб, што не дапоўз да жызнага паветра і моўчкі зваліўся на стол. Мы з Янкам заўважылі, паднялі яго і занесьлі на чарэшню. Наш хварэц крыху варухнуўся і адразу ўзяўся за працу. Як маленькі мядзьведзік, ён доўга барукаўся ў кветцы. Нешта сабе грэбаўся. Высоўваў мечаваты хобат. Піў. Еў. А набраўшыся моцы, перапоўз на іншую кветку. Урэшце, мы забыліся на яго. А ў адзін з летніх сонечных днёў я прытаміўся і сеў на разагрэтыя дровы. Сядзеў і разважаў. Разглядаў медзяную кару, жаўтлявыя кропелькі смалы. І неўзабаве заўважыў: з паленаў вылецеў чмель. За ім другі. Трэці. Ага! Тут іх цэлае гняздо! J так падумалася: а ці ня наш гэта чмялёк здаверыўся ды адважна пасяліўся пад самаю хатаю.

*4.08.2000 г.*

## ВЫТАРАПКА

У яе мяккія варсістыя лапы, пустое сьцябло, і надта вострыя шышачкі. Зельле таму і зельле, што зелянее ад злосьці. Гэта злыя чараўнікі. Лезе настырны пырнік. Злосна ўпіваецца крапіва. Вытарашчылася вытарапка. Асою налятае асот. А яго старэйшага брата чартапалоху нават чарты палохаюцца. І ўсюды сьвірэпа сунецца сьвірэпіца. Вытарапка з асатом адружыліся і пабраліся шлюбам. Цяпер яны разам колюць пяльцоў, што прыйшлі палоць бульбу. Жонка, хоць і здаецца мяккаю – куды люцейшая за мужыка. Да іх у адведкі ходзіць чартапалох, які жыве ў чорта на задворках. А часьцей бывае малачай, малодшы брат, укусы якога не балючыя. Затое малачай поіць малых трусянят расьлінным малаком. А багатка, іх найменшы брат, і зусім ня злы. Ён усьміхаецца сонцу, пчолам, людзям, як малюхны сланечнік... Урэшце, ад настаўніцы біялогіі я даведаўся, што вытарапка – гэта жабрэйка, або папросту зябер – і чары разьвеяліся.

*20.10.2002 г.*

## СЯМЕЙКА

*Ларысе*

Рыжая лілея ня ўмее пахнуць. І таму на яе ніхто не зважае. Цікаўныя насы, што захочуць пацалавацца з кветкаю, зараз жа ўробяцца цёмнаю барваю. А пылок у лілеі густы, касматы, насычаны. І ўся яна, нібы пад павелічальным шклом. Нібы шклянка, налітая какаваю. Керамічныя пялёсткі ўсыпала рэдзенькае ластаўчыньне, а ў цэнтры – цэлая сямейка. Вось мясісты таўкачык, жаночы орган. Магічным кругам яго абступілі тычынкі. Упяцёх. Кожная з іх стараецца аддаць сваю касматую мужчынскую хуць. Чорную, як сажа. Салодкую, як мёд. Няма паміж імі ні сваркі, ні зайздрасьці. Толькі з мляваю жарсьцю выгінаецца мясісты таўкачык. І ўдзячныя губкі доўга глытаюць тлусты пылок.

*13.08.2000 г.*

## *ЦЁМНЫ КУТ*

У цёмным куце хлевушка, як гамак, зьвісае старое павуціньне. І трапіў туды нейкім дзівам вялікі жоўты авадзень. Быжджыць ён, аж павуціньне трасецца. Нахілісься – твар абдае паветрам, быццам ад крылаў ветрака. А вакол паланяніка ўжо стараецца, шчыруе ўвішны чорна-глянцавы павучок: ён то пакаштуе здабычу, то па-гаспадарску абпаўзе, абгледзіць. Воддаль сядзіць у шчыліне і зайздросна цікуе яшчэ адзін павук: маленькі, шэры крыжавічок. Маўчыць, глытае сьліну небарака, а то, набраўшыся адвагі, раз-пораз падбягае да здабычы. Але як толькі чорна-глянцавы павернецца, зыркне ў яго бок, а можа і сыкне на іхняй павучынай мове – крыжавічок адразу ўцякае ў сваю шчыліну і зноў: топчацца, замірае ад нецярплівасьці. Так паўтараецца шмат разоў. Тым часам здабыча даўно ўжо не варушыцца, забітая павучыным ядам, і толькі ціха ляжыць. Як палена, як асмалены вепручок.

*30.08.99 г.*

## *ЖАРТАЎЛІВАЯ ВАРОНА*

Старая варона драмала на голым веснавым дзядзінцы. Абапал ціснуліся глухія, аблупленыя сьцены дамоў. А па дзядзінцы бегаў порсткі рыжы сабачук. Гаспадынін улюбёнец. І далёкі сваяк той баечнай лісічкі-сястрычкі, што падманула некалі дурную варону. Цюцька заўзята і мітусьліва абнюхваў кожны сантыметр цьвёрдай, вільготнай зямлі. Угледзеў варону – і з брэхам кінуўся на яе. Варона пырхнула, крыху адляцела і – зноў села воддаль. Цюцька не надоўга разгубіўся. Набраўшы ў зяпу духу, ён яшчэ раз кінуўся за воронаю. І яшчэ раз усё паўтарылася. І гэтак паўтаралася, аж пакуль цюцька не прыпёр варону да сьцяны. Варона паляцела ў адваротны бок. Урэшце ёй надакучыла аднастайная пагоня. Каб драматызаваць падзеі, яна паднялася вышэй і, як ведзьма на памяле, пачала кружыцца над бедным цюцькам. Сабачка брахаў з апошніх сілаў. А варона кружыла і зьдзекліва гаргала, нібы сьмяялася, пакуль ёй і гэта не надакучыла. Тады яна ўзьнялася і звольна паляцела! Шчасьлівая, быццам учыніла сьвятую помсту. За той, адабраны лісіцаю сыр.

*30.08.99 г.*

## *СУЧКА ПАД КОЛАМІ*

Гэта было ў час этнаграфічнае эксьпедыцыі. Наш музейны аўтобус адольваў вясковую вуліцу, якая, праўдзівей, больш удавала грэблю. Наперадзе паказалася сабачае вясельле. Адзін кавалер пасьпеў адваяваць сабе пасію. І толькі ён заняўся сваёю сабачаю работай, як на жарлівую парачку наехаў грузавік. Жаніх першы ўгледзеў небясьпеку і пасьпеў сігануць убок, а нявеста засталася пад коламі. За лічаныя долі

хвіліны яе колькі разоў кідала ад кола да кола. Цяжка сказаць, ці шмат болю і страху за адзін момант перажыла бедная сучка! Але яна ўратавалася. І першае, што зрабіла, — упілася свайму жаніху ў загрывак. А ў нашым музеі пасьля прыжыўся выраз: круцíцца, як сучка пад коламі.

*31.08.99 г.*

## САЛА

У нядзельным аўтобусе падпіты народ спрачаўся пра сала. Пагадзаліся на тым, што сала апошнім часам зусім схуднела. Ці то сьвіньні ня тыя. Ці корм іншы. Але сала, як няма, так няма. І толькі адзін дзядзька, аграмадны, лупаты, з выразным украінскім акцэнтам гучна паўтараў:

– Цэ час такі!.. Цэ час такі!..

Я ўслухоўваўся ў ягоныя словы і стараўся даўмецца: якая ж містычная прычыннасьць можа існаваць паміж салам і часам? Кант казаў, што час – гэта пустая апрыёрная форма, у якой мы разважаем рэчы. А вось у гэтага ўкраінца час, відавочна, меў іншую прыроду. Напэўна гэты час мог цячы, расьці, застываць, капаць, дыміцца і гарэць, як сала.

*14.08.2000 г.*

## ЧАС

Ёсьць час астранамічны, ёсьць біялагічны, ёсьць эстэтычны... А ёсьць час вясковы. Нeяк, яшчэ пры Савецкім Саюзе, паехаў камсамольскі інструктар у вёску. Па справах. Вяртаецца дахаты і чакае рэйсавага аўтобуса. Заставалася пятнаццаць хвілінаў. Аўтобуса няма. Але з хвіліны на хвіліну мусіць быць. Перачакаў лішнія дзесяць хвілінаў. Няма. Перачакаў яшчэ дзесяць. Мусі’ спазьняецца? Думае, крыўдна будзе, калі ён адыдзецца, а аўтобус – шась! – і паехаў. Гэтак прачакаў з паўгадзіны. Потым яшчэ гадзіну. Прыязджае, урэшце, нейкая машына. Здымаюць шыльду з раскладам і вешаюць новую. Бразнулі дзьверцамі. Газанулі. Зьніклі. Бедны інструктар падходзіць, чытае і бачыць: ягоны аўтобус прыедзе толькі праз дзьве гадзіны. Дзе тут, як той казаў, пасьпяшаесься...

*21.10.2002 г.*

## ДЗЬВЕ ПЕСЬНІ

Калі ў наш край зайшлі тыя першыя саветы, то, кажуць, злавілі пана, што не пасьпеў уцячы, і сьмехам пераапранулі яго ў пастухова адзеньне. А пастуха ў панскае. Так пачалася чарада пераапрананьняў.

Сына старога Кірдопа, які толькі сядзеў на печы і чытаў кнігі, а хлеба

меў усяго да Калядаў, бо ленаваўся рабіць, паставілі на работу ў сельсавеце. Спатыкае Кірдоп майго дзеда і кажа:

– Бранюк, ці ведаеш ты, як сьвет адмяніўся? Цяпер ёсьць такая песьня: «Кто был нічым, тот стал усім!»

– А я ведаю другую песьню, – кажа дзед, – «Какім ты был, такім астаўся...»

І праўда. Неўзабаве малодшага Кірдопа прагналі з сельсавету. А дзеці гэтакіх худакоў і парабкаў толькі пасьпіваліся ў калгасах.

Чаго вартае было тое пераапрананьне?

*15.08.2000 г.*

## НАКАРМІЛІ

Адразу пасьля вайны, казаў мне дзед, жылося куды страшней як у вайну. Удзень прыходзілі саветы. Уночы – партызаны. Пойдзеш дакладзеш на партызанаў – прыйдуць і спаляць. Даведаюцца саветы, што памагаў партызанам – зараз прыедзе чорны воран і вывязе на белых медзьвядзёў. Але партызанаў скора ня стала. Каго злавілі, каго падстрэлілі. Загінуў і Букатка з хлопцамі. Застаўся адзін Сюськін. І цягаўся ён у сваім рыжым аблезлым кажуху ад хаты да хаты. Прасіў, то грозьбаю, то просьбаю, каб дзе чаго ўкусіць далі. І раптам зьнік. Ніхто ня чуў, куды ён падаўся. Толькі ўвесну знайшлі. Ляжаў забіты на балоце: у зубы ўперты вялікі кавалак сала, а на шыі закручаны калючы дрот.

*31.08.2000 г.*

## ЗЫЧЛІВЕЦ

Як ні круці, а любяць нашыя людзі засьведчыць сваю зычлівасьць перад новаю «ўласьцю». Так было і гэтым разам. У хлеў да Чартовага бацькі схаваўся немец. Гаспадар, як толькі агледзеў яго, зараз пабег сьведчыць аб сваёй зычлівасьці. Зьявіліся аўтаматнікі. Спуджаны немец кінуўся праз гароды наўцёкі. А там возера. Бедалага! Ён нават даў рады да сярэдзіны даплыць. Але разьюшаная савецкая куля яго і там дастала, бо цьвёрда ведала, што гэта вораг. Салдаты на хвіліну прыціхлі. І, раптам, новаму свайму зычліўцу, загадалі:

– Выцягвай яго!

Ад нечаканасьці той замітусіўся. Кінуўся шукаць лодкі. Але атрымаў новы загад:

– Цягні так! Бяз лодкі. Ты ж хацеў нам дапамагаць?..

І што ж... Разганяючы жоўтыя кубачкі лотаці, цягнуў зычлівец сваю здабычу праз усё возера. А потым моўчкі, пад рулямі аўтаматаў, закопваў на сваім гародзе. І, хто ведае, ці хавалі буйныя кроплі вады і поту яго запозьненую сьлязу.

*2000 г.*